Бусько С. І. Палітычны кантроль над беларускім нацыянальным рухам у Расійскай імперыі ў пачатку XX ст. / С. І. Бусько // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 6 / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск: БДУ, 2011. — С. 12–19.

***С. І. БУСЬКО***

# ПАЛІТЫЧНЫ КАНТРОЛЬ НАД БЕЛАРУСКІМ НАЦЫЯНАЛЬНЫМ РУХАМ У РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ Ў ПАЧАТКУ XX ст.

Палітычны кантроль – гэта сістэма рэгулярнага збору і аналізу інфармацыі розныміадгалінаваннямі дзяржаўнага апарату аб настроях у грамадстве, аб адносінах розных яго слаёў да мерапрыемстваў улады, аб паводзінах і намерах экстрэмісцкіх і антыўрадавых партый і арганізацый. Ён заўсёды ўключае некалькі базавых элементаў: збор інфармацыі, яе асэнсаванне, прыняцце рашэнняў, улічваючых настроі грамадскіх груп, а таксама палітычны вышук і рэпрэсіі пры наяўнасці пагрозы існуючаму дзяржаўнаму ладу.

Асноўнай структурай Дэпартамента паліцыі ў Расіі для нагляду за радыкальнымі рухамі і арганізацыямі з’яўляўся Асобы Аддзел. Яго дзейнасць пачалася з 1 студзеня 1898 г. у сувязі з ростам грамадскай напружанасці, што адзначаў у справаздачы за 1897 год дырэктар Дэпартамента паліцыі С. Э. Звалянскі. Галоўнымі задачамі Аддзела ў гэты час былі: кіраванне ўнутранай і знешняй агентурай, перлюстрацыя, нагляд за студэнцкім рухам, кантроль за палітычнымі настроямі працоўных і інш.

Па меры ўзрастання арганізаванага працоўнага руху, узнікнення партый у Аддзеле актывізуецца праца па арганізацыі палітычнага вышуку ў гэтым накірунку. Узмацняецца сувязь мясцовых губернскіх жандарскіх упраўленняў (ГЖУ) і Асобага Аддзела ў распрацоўцы нацыянальных партый. У адказ на рост палітычных партый і арганізацый Асобы Аддзел падзяляецца на Асобы аддзел А і Асобы аддзел Б. Першы займаўся ўласна дзейнасцю партый і нават ствараў уласныя фракцыі для ўплыву на партыі знутры, другі асноўную ўвагу надаваў прафесійным саюзам і масавым выступленням. Улічваючы вялікую ролю, якую мелі партыі ў час рэвалюцыі 1905—1907 гг., у Асобым аддзеле А праводзіцца спецыялізацыя па партыйнай лініі. Ствараюцца 4 аддзяленні, кожнае з якіх займаецца наглядам, вышукам, распрацоўкай агентурных звестак па пэўных партыях і арганізацыях [8, с. 82—86]. Сярод іх 2-е аддзяленне займалася эсэраўскімі арганізацыямі і анархістамі, 3-е — спецыялізава-

**Бусько Сяргей Іванавіч** — аспірант кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта



лася на сацыял_дэмакратыі: РСДРП, Спілка, БУНД і інш., 4-е — назірала за шматлікімі антыўрадавымі саюзамі і нацыянальнымі партыямі (у тым ліку ППС і БСГ).

Адбываецца сістэматызацыя партый і арганізацый, складаецца пералік небяспечных партый, што патрабуе пільнай увагі па кожным рэгіёне. Так, на думку Дэпартамента паліцыі, асноўная ўвага павінна была належаць: «1) ПСР з яе саюзамі, баявой арганізацыяй; 2) Усеагульнаму яўрэйскаму працоўнаму саюзу ў Польшчы, Літве і Расіі (БУНД, асабліва для беларускіх губерняў); 3) РСДРП у выглядзе яе мясцовых саюзаў, камітэтаў і груп фракцый “большинства” і “меньшинства”; 4) ППС, СДКПіЛ і партыі “Пралетарыят” (для заходніх губерняў імперыі); 5) усе іншыя лакальныя нацыянальныя партыі (ЛСДП, Сакартвело, Дашнак цутюн, БСГ)».

Фонды Асобага Аддзела Дэпартамента паліцыі і ахоўных аддзяленняў у Дзяржаўным архіве Расійскай Федэрацыі (ДА РФ) дазваляюць прасачыць эвалюцыю поглядаў жандараў на беларускі нацыянальны рух. Кожнае ахоўнае аддзяленне, а на тэрыторыі пяці беларускіх губерняў іх было тры – Віленскае (1902—1909 гг.), Беластоцкае (1906—1910 гг.), Паўночна_Заходняе раённае (1907—1914 гг.), — павінна было два разы ў год рабіць справаздачу па ўсіх палітычных партыях і арганізацыях на кантралюемай тэрыторыі. Звычайна першая характарыстыка складалася з трох частак: праграма партыі, апісанне часу ўзнікнення і пачатку дзейнасці ў разглядаемай губерні, сціслы аналіз мясцовых камітэтаў партыі. На падставе дадзеных справаздач штогод фарміраваўся «Обзор революционных партий с кратким изложением программ, тактики и организации их» [7]. У адрозненне ад РСДРП, БУНДу ці анархістаў «Беларуская сацыялістычная Грамада» не патрабавала абавязковага агляду, і матэрыялы аб яе дзейнасці змяшчаліся не вельмі часта, звычайна паміжпрыбалтыйскімі сацыял-дэмакратычнымі партыямі і ўк раінскай партыяй Спілка.

Першыя дадзеныя аб дзейнасці БСГ у матэрыялах Дэпартамента паліцыі адносяцца да 1905 г. Асобы Аддзел зрабіў запыт па губернях Паўночна-Заходняга краю аб БСГ. Кіраўнік Мінскага губернскага жандар-

скага ўпраўлення палкоўнік П. П. Усясвяцкі дае наступную характарыстыку: «Согласно агентурным сведениям программа «Белорусской социалистической Громады» сходна с революционной программой и направлена преимущественно на агитацию среди крестьян и организацию союзов между ними. Партия возникла не в г. Минске, а, кажется, в Киеве; в Минске же появились лишь отдельные агитаторы,



увлекшие в свою группу Григория и Иосифа Сорок и Степана Балановского» [3, л. 2]. У той жа час адзначалася, што пракламацыі на беларускай мове распаўсюджваюцца амаль заўсёды з лістоўкамі партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Віцебскае і Магілёўскае жандарскія ўпраўленні адказвалі лаканічна, што інфармацыя па дадзенай партыі адсутнічае. Неабходна адзначыць, што ў губернскіх упраўленнях успрымалі слова «белорусская» як тэрытарыяльны аспект. Так, у справаздачы кіраўніка ахоўнага аддзялення г. Масквы ў 1909 г. БСГ разглядаецца ў раздзеле «Социалистические партии на территории Литвы и Белоруссии» [4, л. 6].

Спецыяльнай агентуры па БСГ у мясцовых жандарскіх упраўленнях не было да 1908—1909 гг. Асноўныя звесткі і ўвогуле матэрыял аб існаванні такой партыі траплялі ў ГЖУ выпадкова, пры наглядзе за эсэрамі, анархістамі і членамі ППС. Напрыклад, на члена «Беларускай сацыялістычнай Грамады» Віктара Зелязея, на мінскай кватэры якога адбыўся II з’езд БСГ у 1906 г., Мінскае ГЖУ трапіла падчас назірання за анархістам Беркам Энгельсонам, адным з лідараў беластоцкага «Черного знамени» і заснавальнікам выдавецтва «Анархия». Прасачыўшы за яго кантактамі, а ў 1905—1906 гг. канспірацыя рэвалюцыянераў паслабела, жандарскае ўпраўленне высветліла частку мінскага камітэта БСГ. Вобыск 6 кастрычніка 1906 г. у Розы Садоўскай і Басі Маршак, што працавала разам з Зелязеем, дазволіў знайсці пракламацыі БСГ, на падставе чаго было распачата фармальнае дазнанне. Браты Віктар і Сігізмунд Зелязеі былі арыштаваны ў ноч з 28 на 29 лютага 1908 г. і высланы ў Сібір.

У Гродзенскай губерні яшчэ ў 1904 г. пры вобысках кватэр членаў ППС былі заўважаны брашуры з літарамі B.S.G. на вокладках, а напярэдадні маёўкі 1905 г. у Гродна на канспіратыўнай кватэры студэнта Варшаўскага ветэрынарнага інстытута Станіслава Трускоўскага быў знойдзены партыйны штэмпель B.S.G. З дзеячаў ППС у Гродзенскай губерні, па звестках ротмістра Гродзенскага жандарскага ўпраўлення Аляксандра Мацкевіча (які займаў названую пасаду 12 гадоў), дапамагалі БСГ Франц Эдукевіч, Станіслаў і Казімір Трускоўскія, Пётр Шумаў і Браніслаў Шушкевіч [4, л. 20]. Стасункі паміж Грамадой і ППС для жандараў таямніцай не з’яўляліся, наадварот, яны падкрэслівалі адпаведнасць паміж праграмамі гэтых партый, а браты Трускоўскія лічыліся заснавальнікамі «Сацыялістычнай Партыі Белай Русі» [14, с. 161—162]. Аднак члены ППС у беларускіх губернях у сваіх успамінах гэтыя факты не ўзгадваюць [16].



Паміж цэнтральнымі ахоўнымі аддзяленнямі Масквы і Пецярбурга і мясцовымі жандарскімі ўпраўленнямі існавала жорсткая канкурэнцыя. Асабістыя ўзаемаадносіны накладалі адбітак на прафесійную дзейнасць органаў палітычнай паліцыі. Так, Маскоўскае ахоўнае аддзяленне вызначае колькасць членаў БСГ на верасень 1909 г. у 1—2 тыс. чалавек, у асноўным па Мінскай губерні. У той жа час кіраўнік Мінскага ГЖУ ў кастрычніку 1909 г. пазначае, што «в Минской губернии «Белорусская социалистическая Громада» проявляла свою деятельность исключительно благодаря постоянному влиянию из г. Вильно и что была постоянно пресекаема в самом начале деятельности. Со времени последней ликвидации деятельность «Белорусской социалистической Громады» в Минской губернии прекратилась совершенно, а сведения в 1—2 тыс. членов сильно в Департаменте полиции преувеличены. В настоящее время, вследствие несуществования «Белорусской социалистической Громады» в Минской губернии, список членов и освещение агентами отсутствует» [4, л. 11]. У адказ кіраўнік Віленскага раённага ахоўнага аддзялення падкрэсліваў, што цэнтрам нелегальнай дзейнасці партыі БСГ з’яўляецца Мінск, а ў Вільні выдаецца толькі легальны часопіс, прысвечаны беларускаму насельніцтву сацыялістычнага накірунку.

Пры наглядзе за мясцовым рэвалюцыйным рухам узнікалі складанасці ва ўзаемаадносінах паміж пракурорскай уладай і жандарскімі чынамі. З-за маруднасці разгляду спраў у Мінскім ГЖУ пракурор Віленскай судовай палаты быў вымушаны вызваляць з-пад арышту абвінавачаных, напрыклад групу А. Бонч_Асмалоўскага ў 1909 г. Спробы скардзіцца ў Пецярбург на мясцовых жандараў выніку не мелі: «Последствием рапортов и обращений явилось лишь обострение отношений между Минским прокурорским надзором и начальником жандармского управления, который, оставив, вопреки предписаниям начальства, подполковника Завьялова, переведенного в Златоуст, при своем управлении, исключительно с целью сделать неприятность местному прокурору, статскому советнику Бенико» [6, л. 7]. Працягласць следства была звычайнай з’явай нават у спрыяльных умовах з_за недахопу супрацоўнікаў, іх частай змены. Як прыклад, можна ўзгадаць справу арганізатараў нелегальнага настаўніцкага з’езда 10 ліпеня 1906 г. у в. Мікалаеўшчына, сярод якіх быў і Якуб Колас, што пачала разглядацца ў Віленскай судовай палаце толькі 15 верасня 1908 г. Дадзеная справа была распачата палкоўнікам А. Хрыпавым, скончана падпалкоўнікам Я. Заўялавым. За 1905 г. у Віцебскім ГЖУ налічвалася 181 новае дазнанне, на красавік 1906 г. 154 дазнанні чакалі завяршэння і перадачы ў суд [5, л. 1—6].

Не маючы ў час рэвалюцыі дастатковых рэсурсаў, кіраўніцтва мясцовых жандарскіх упраўленняў выкарыстоўвала эфектыўную, але кароткатэрміновую тактыку: скіроўваючы філераў і агентуру на найбольш важныя антыўрадавыя гурткі эсэраў і анархістаў, для ўздзеяння на дробныя арганізацыі выкарыстоўвалі «топтунов», г. зн. філераў, асноўная мэта якіх – напалохаць рэвалюцыянераў, прымусіць іх змяніць месцажыхарства ці знішчыць лістоўкі і друкарскія прыналежнасці. Магчыма, менавіта такі лёс напаткаў падрыхтаваную В. Іваноўскім на гектографе ў м. Лябёдка Лідскага павета газету «Свабода». Заўважыўшы ролю братоў Луцкевічаў у арганізацыі гурткоў у Мінску ў канцы 1905 г., мясцовыя філеры адкрыта пачалі наглядаць за іх домам па вуліцы Хрышчэнскай, 27 і прымусілі іх збегчы ў Вільню. Аднак кожная спроба пачаць актыўную антыўрадавую дзейнасць перапынялася адразу, ці то сельска-гаспадарчыя забастоўкі, ці то нелегальныя настаўніцкія з’езды, ці нават спробы захапіць уладу па прыкладзе А. Бурбіса ў Мейшагольскай воласці. Пастаяннае знішчэнне жандарамі партыйных гурткоў БСГ прызнавалі і яе лідары [11, с. 8—9].

Пасля заканчэння рэвалюцыі 1905—1907 гг. Дэпартамент паліцыі атрымаў магчымасць больш увагі надаваць дробным нацыянальным партыям. У 1908—1910 гг. у Віленскім жандарскім упраўленні былі падрыхтаваны дзве дакладныя запіскі пад назвай «Обзор истории революционного движения в Белоруссии и возникновение Громады». Яны амаль цалкам заснаваны на артыкуле А. Луцкевіча [9, л. 1—5; 2, с. 31—40]. Дарэчы, згаданая ў артыкуле Беларуская нацыянальная хеўра – група навучэнцаў Глухаўскага настаўніцкага інстытута Чарнігаўскай губерні адразу была ліквідавана. За прывітальны адрас да 3-годдзя «Нашай Нівы» ініцыятарам акцыі Льву Кутасу і Адаму Калоле была зроблена строгая вымова і ўведзены за імі негалосны нагляд.

У жандарскіх упраўленнях лічылася абавязковым знаёмства з лідарамі, тактыкай і зместам партыйнай праграмы кожнай мясцовай арганізацыі. Як вынік, чыны ахоўных аддзяленняў і ГЖУ ў 1909 г. някепска ведалі асаблівасці «Беларускай сацыялістычнай Грамады»: «БСГ (B.S.H.) имеет расплывчатую программу, нечто среднее между социал-демократами и социалистами-революционерами. По тактике ближе к первым, т. е. не признает террор… входили в ЦК партии А. Власов (революционная кличка «Старший»); братья Иван и Антон Луцкевичи (соответственно «Сченсный» и «Генрих»); инженер-электротехник Г. Ивановский («Химик»); студенты Санкт-Петербургского технологического университета С. Кейрис, В. Власов, В. Ивановский; дочь генерал-майора



В. Пашкевич; лидская мещанка А.Пашкевич» [4, л. 6, 19]. Цікава, што члены БСГ не горш ведалі і чыноў палітычнай паліцыі. Антон Луцкевіч нават праз 25 гадоў згадвае палкоўніка Мінскага ГЖУ А. Хрыпава, які вёў яго справу, і кіраўніка Віленскага ахоўнага аддзялення падпалкоўніка К. Шыбеку [2, с.146, 164].

Шмат увагі ў жандарскіх упраўленнях надавалася перыядычнаму друку, асабліва пасля 17 кастрычніка 1905 г. Так, кіраўнікі Мінскага жандарскага ўпраўлення спачатку палкоўнік М. Васільеў і пасля палкоўнік П. Усясвяцкі ўважліва сачылі за зместам і напрамкам газеты «Северо-Западный край», а ў сакрэтным данясенні ад 2 чэрвеня 1905 г. апошніпаведамляў, што газета прыняла тэндэнцыйны антыўрадавы напрамак і нават надрукавала «пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!» у № 755 за 26 мая. Мінскі жандар прапанаваў выданне газеты спыніць, а рэдактара М. Мысаўскага «як супрацьурадавага агітатара» выслаць з Паўночна-Заходняга краю. Што неўзабаве, у тым жа месяцы, было і зроблена [1, с. 171]. Такі ж лёс напаткаў «Голос Белоруссии» ў студзені, а «Нашу Долю» — у лістападзе 1906 г. Набор першага нумара газеты «Жизнь Белоруссии» жандары арыштавалі яшчэ ў друкарні.

25 кастрычніка 1906 г. Сігізмунд Вольскі атрымаў пасведчанне на выданне штотыднёвай грамадска-палітычнай газеты на беларускай мове пад назвай «Наша Ніва». З гэтай падзеі пачалася якасна новая старонка ў развіцці беларускага нацыянальнага руху. Новае выданне адразу трапіла пад нагляд адпаведных органаў кантролю. Выпрацаванай тактыкі ў адносінах да «Нашай Нівы» ў жандараў не існавала, яе дзейнасць разглядалася на агульных умовах у адпаведнасці з заканадаўствам. Асноўнымі сродкамі палітычнага кантролю за выданнем былі: канфіскацыя пэўных нумароў, перлюстрацыя карэспандэнцыі, выкарыстанне «положения о чрезвычайной охране» для забароны некаторых артыкулаў, грашовыя штрафы, арышт рэдактара і інш. Газета распаўсюджвалася па падпісцы, што было вельмі карысна для ахоўных аддзяленняў, бо дазваляла вызначаць спачуваючых беларускаму руху. Нездарма бясплатнае і без падпіскі распаўсюджванне «Нашай Нівы» ў Беластоку на верасень 1912 г. было забаронена, як і часопіса «Саха», газеты «Минский голос» [13, л. 662]. Прагляд карэспандэнцыі з’яўляўся нормай у Расійскай імперыі, пункт перлюстрацыі існаваў у Вільна з другой паловы XIX ст., і зразумела, што пісьмы ў рэдакцыю выклікалі цікавасць палітычнай паліцыі. Асабліва тыя, што ўтрымлівалі забароненыя дадзеныя. Так, 5 палітычных ссыльных беларусаў з Іркуцкай губерні ў 1910 г. прасілі даслаць ім «Нашу Ніву» з абяцаннем выслаць матэрыялы пра рух палітычных

зняволеных у Сібіры. Такія ж лісты прыходзілі і з іншых месцаў, з Архангельскай і Томскай ссылкі.

Адно з самых важных пытанняў, якое добра адлюстравана ў гістарыяграфіі праблемы, гэта арышт асобных нумароў «Нашай Нівы» [12, с. 141; 15, с. 186—188]. Былі арыштаваны № 8 (канфіскавана 668 экзэмпляраў з агульнага тыражу ў 1500 шт.), № 9 (970 экзэмпляраў), № 12 (прыкладна 300 экзэмпляраў) за 1907 г. На думку віленскага інспектара па справах друку А. Кемерлінга, які цесна супрацоўнічаў з ахоўным аддзяленнем, некаторыя артыкулы «в состоянии сильно взволновать простого малоинтеллигентного читателя белорусской газеты и внушить ему неуважение к суду, полиции, земскому начальнику, помещику, к войску, к законам государства и сделать его легкою жертвою преступной пропаганды» [10, с. 167—168]. Вядомы артыкул з № 8 за 1907 г. «Зямельная справа ў Новай Зеландыі» ўяўляў сабою пераклад з украінскай мовы забароненай літаратуры. У друкарні М. Кухты яго надрукавалі не толькі ў часопісе, але і асобнымі лістоўкамі.

На гэтай падставе ўжо ў жніўні 1907 г. было распачата фармальнае дазнанне аб захоўванні і распаўсюджванні нелегальнай літаратуры вучнямі Маладзечненскай настаўніцкай семінарыі Д. Крывадубскім, М. Вайцяховічам, С. Калядка ў час іх пражывання на адпачынку ў Слуцкім павеце. Былі арыштаваны вучні той жа семінарыі М. Шыла і Л. Шашура, якія заявілі, што з'яўляюцца агентамі рэдакцыі часопіса «Наша Ніва» па яго продажы і брашур на беларускай мове. Гэта стала падставай для вобыску ў рэдакцыі «Нашай Нівы», дзе было знойдзена 3600 экзэмпляраў нелегальнай брашуры «Зямельная справа ў Новай Зеландыі», як вынік 11 лістапада 1907 г. друкарня М. Кухты была зачынена на два тыдні [4, л. 10]. Жандары атрымалі выдатную падставу для вобыску ўсіх падпісчыкаў часопіса, якія выпісалі забароненыя нумары. У верасні 1908 г. А. Кемерлінг паслаў у Санкт-Пецярбургскі камітэт па справах друку ліст № 351 і некалькі кніг («Жалейка» Я. Купалы, «Дудка беларуская» і «Смык беларускі» Ф. Багушэвіча) з запытаннем: «могут ли они быть допущены к обращению» [1, с. 135]. Вынікі былі чакаемыя, і калі арышт з «Жалейкі» знялі, то творы Багушэвіча ў лістападзе 1908 г. паставілі пад забарону. І амаль адразу ў 1909 г. арыштавалі селяніна Віленскага павета М. Станкевіча, у якога знайшлі 13 экзэмпляраў «Дудкі беларускай» і 12 — «Смыка беларускага».

І ўсё ж беларускі нацыянальны рух не з'яўляўся важным аб'ектам для органаў палітычнай паліцыі Расійскай імперыі. Першапачаткова ён разглядаўся як частка польскага нацыянальна_вызваленчага альбо агуль-



нарасійскага сацыялістычнага руху. Аднак кантроль нават за такімі дробнымі праявамі антыўрадавай дзейнасці, як праца «Беларускай сацыялістычнай Грамады», быў выдатна арганізаваны, асабліва з 1907—1908 гг. БСГ у 1908—1914 гг. як палітычная адзінка амаль не функцыянавала, а «Наша Ніва» і іншыя грамадскія формы актыўнасці беларускага насельніцтва дазваляліся толькі ў межах закону.

**ЛІТАРАТУРА**


1. *Александровіч, С. Х.* Пуцявіны роднага слова / С. Х. Александровіч. Мінск : Выд-ва БДУ, 1971. 245 с.
2. *Луцкевіч, А.* Да гісторыі беларускага руху: выбраныя творы / А. Луцкевіч. Мінск : Беларускі кнігазбор, 2003. 288 с.
3. О «Белорусской социал_демократической Громаде» // Государственный архив Российской Федерации (далее — ГАРФ). Ф. 102. Оп. 233а. Д. 5. Ч. 67.
4. О «Белорусской социалистической Громаде» // ГАРФ. Ф. 102. Оп. 238. Д. 248.
5. О временном усиленном личном составе чинов Витебского ГЖУ // ГАРФ. Ф. 110. Оп. 2. Д. 10846.
6. Об увольнении со службы начальника Минского губернского жандармского управления полковника Всесвятского // ГАРФ. Ф. 110. Оп. 2. Д. 11362.
7. Обзор революционных партий с кратким изложением программ, тактики и организации их // ГАРФ. Ф. 102. Оп. 253. Д. 7.
8. *Перегудова, З. И.* Политическая полиция Российской империи (1880—1917) /
З. И. Перегудова. М. : АСТ, 2000. 416 с.
9. Переписка с начальником Виленского губернского жандармского управления о руководстве и деятельности партии «Белорусская соц. Громада». Программа «Белорусской соц. Громады» // ГАРФ. Ф. 267. Оп. 1. Д. 59.
10. *Смолкін, М.* Плямы царскай цэнзуры / М. Смолкін // Полымя. 1966. № 3. С. 162—170.
11. Стары Пілiп (Бурбіс А.). Кароткі агляд беларускага нацыянальнага-рэвалюцыйнага руху / Стары Пiлiп // Веснік Нар. Камісарыята Асветы Сацыялістычнай Радавай Рэспублікі Беларусь. 1921. № 1. С. 4—9.
12. *Унучак, А. У.* Міністэрства ўнутраных спраў Расійскай імперыі і газета «Наша Ніва» / А. У. Унучак // Милиции Беларуси 90 лет: история и современность: материалы науч.-практ. конф. (Минск, 27 февр. 2007 г.) / Мин_во внутр. дел Респ. Беларусь, Акад. МВД; редкол.: К. И. Барвинок (отв. ред.) [и др.]. Минск : Академия МВД Респ. Беларусь, 2007. С. 140—146.
13. Циркуляры Департамента полиции и Отдельного Корпуса жандармов о работе губернских жандармских управлений // Национальный исторический архив Республики Беларусь в г. Гродно. Ф. 366. Оп. 1. Д. 83.
14. *Шлюбскі, А.* Да гісторыі Б.С.Г. / А. Шлюбскі // Полымя. 1925. № 5. С. 157—163.
15. *Шлюбскі, А.* Да гісторыі канфіскацыі «Нашай Нівы» / А. Шлюбскі // Полымя. 1925. № 4. С. 185—189.
16. *Szuszkiewicz, B.* Organizacja grodzienska P.P.S., 1898—1910 / B. Szuszkiewicz. Warszawa, 1937. 59 s.


Артыкул паступіў у рэдакцыю 30 сакавіка 2010 г.